# Нашы юбіляры

## ДЗМІТРЫЙ ЯКАЎЛЕВІЧ БУГАЁЎ



Спаўняецца 75 гадоў Дзмітрыю Якаўлевічу Бугаёву, літаратурнаму крытыку, літаратуразнаўцу, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа, прафесару БДУ. Ён – бліскучы лектар і прапагандыст роднага слова. Сваёй энергіяй, эрудыцыяй, красамоўствам, логікай, досціпам Дзмітрый Якаўлевіч зараджае студэнцкую моладзь і сам напаўняецца радасным адчуваннем перспектывы, якою натуральна жыве і дыхае новае пакаленне. На чым грунтуецца яго апантанасць? Адказ адзін: на вернасці свайму прызванню змагара за Бацькаўшчыну, красу якой ён бачыць найперш у мастацкім слове, у роднай літаратуры, у навуковай ісціне.

Нарадзіўся Дз. Бугаёў 12 студзеня 1929 г. у вёсцы Сычык Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння няпоўнай сярэдняй школы паступае ў Магілёўскае педвучылішча (1945–1948), затым вучыцца на факультэце мовы і літаратуры Магілёўскага педінстытута (1948–1952). Пасля вучобы ў аспірантуры пры Мінскім педінстытуце (1952–1955) Дз. Бугаёў працаваў старшым выкладчыкам кафедры літаратуры Мазырскага педінстытута (1955–1959), затым навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры АН БССР (1959–1964), дзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1964 г. Дз. Бугаёў вярнуўся на выкладчыцкую працу (з 1964 г. – дацэнт, а з 1987 г. – прафесар БДУ) і спалучаў яе з навуковай дзейнасцю, узяўшы на сябе цяжкую місію ўмацавання камунікацыі паміж вышэйшай школай і даследчымі арганізацыямі, укаранення навуковых дасягненняў у адукацыйным працэсе. Гэта імкненне да інтэграцыі выяўляецца і ў серыі навуковых манаграфій Дз. Бугаёва, выдадзеных адна за адной: "Паэзія Максіма Танка" (1964; 2-е выд., 2003), "Уладзімір Дубоўка" (1965), "Максім Гарэцкі" (1968; 2-е выд., 2002), "Шматграннасць" (1970), "Зброяй сатыры, зброяй праўды" (1971). Навуковы, акадэмічны падыход спалучаецца ў гэтых кнігах з папулярнай манерай выкладання, разлічанай не толькі на прафесіяналаў, але і на ўсіх, хто цікавіцца творчасцю "забароненых" і "забытых", у тым ліку і "жывых класікаў". На той час гэта былі кнігі-адкрыцці, якія ўбіралі ў сябе вынікі архіўных пошукаў, уважліва-любоўнага вывучэння першакрыніц, пісьменніцкіх рукапісаў. Фактура даследаванняў Дз. Бугаёва заўсёды надзвычай багатая і шматстайная, што сведчыць аб яго універсалізме і энцыклапедызме. У далейшым гэтыя якасці і асаблівасці даследчыцкага таленту паглыбіліся і ўдасканаліліся ў навуковых манаграфіях "Вернасць прызванню" (1977), "Чалавечнасць" (1984), "Васіль Быкаў" (1987), "Арганічнасць таленту" (1989), прысвечаных творчасці В. Каваля, П. Галавача, М. Лобана, А. Чарнышэвіча, І. Мележа, В. Быкава, Я. Брыля, І. Шамякіна, І. Навуменкі, А. Адамовіча, М. Аўрамчыка, А. Лойкі, І. Чыгрынава, А. Вярцінскага, М. Стральцова, Г. Бураўкіна, Я. Янішчыц і інш. Класічная спадчына і бягучы літаратурны працэс вывучаюцца, асэнсоўваюцца Дз. Бугаёвым з асаблівай зацікаўленасцю, бо за гэтымі творчымі з'явамі бачыцца нешта большае, а менавіта – росквіт беларускай літаратуры, яе імкненне выйсці ў вялікі свет.

Асаблівае месца ў навуковай дзейнасці даследчыка займае кніга літаратурных артыкулаў "Талент і праца" (1979), за якую аўтар узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа (1984). Пакаленне Дз. Бугаёва добра засвоіла базавую ісціну: талент, пазбаўлены сумлення і маралі, лёгка можа ператварыцца ў амаральнасць, а шлях да

агульначалавечага пачынаецца з асабовага, беларусы як нацыя здольны заявіць пра сябе ў поўны голас.

Напрацаваная ім на працягу пяці дзесяцігоддзяў творчай дзейнасці літаратуразнаўчая тэхналогія плённая і ў новых акалічнасцях. Аб гэтым выразна сведчаць публікацыі Дз. Бугаёва апошняга часу, сабраныя ў кнігах "Дасягнутае і страчанае" (1999), "Спавядальнае слова" (2001), у шматлікіх артыкулах, рэцэнзіях, успамінах, якія рэгулярна з'яўляюцца ў друку і нязменна выклікаюць цікавасць у чытача, у аглядных артыкулах і творчых партрэтах, змешчаных у многіх "Гісторыях" беларускай літаратуры, падручніках для ВНУ і сярэдніх школ Беларусі. Сфера даследавання прафесара Дз. Бугаёва хутка пашыраецца, уключаючы такія цікавыя з'явы творчага жыцця рэспублікі, як раман А. Мрыя "Запіскі Самсона Самасуя", творы В. Казько. Не застаецца па-за ўвагай крытыка амаль ніводзін апублікаваны твор В. Быкава, прычым водгукі заўсёды вылучаюцца грунтоўнасцю літара туразнаўчага аналізу.

Дзмітрыю Якаўлевічу Бугаёву, несумненна, уласціва вобразнае бачанне свету. Аб гэтым выдатна сведчаць яго ўспаміны "Жыццём ідучы...", у якіх шмат цікавых падрабязнасцей з жыцця 30–40-х гг. XX ст. Творчасць юбіляра заўсёды выклікае цікавасць, асабліва настаўнікаў, вучняў і студэнтаў, для якіх кожная такая публікацыя можа паслужыць своеасаблівым падручнікам.

***М.А. Тычына,***
доктар філалагічных навук, прафесар БДУ